УДК 327.33

А. А. Райчонак, ст. выкладчык

# II КАНСТЫТУЦЫЯ БССР 1927 г. – ЗАМАЦАВАННЕ САВЕЦКАГА РАЗУМЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ

The modification of the comprehension of the essence of the Belarusian statehood in the 1927 Constitution of the BSSR.

У год прыняцця другой Канстытуцыі БССР ва ўнутрыпалітычным і знешнепалітычным становішчы СССР адбыліся значныя змены. Часовае паражэнне камуністаў у Кітаі, на перамогу якіх Камінтэрн ускладаў спадзяванні як на працяг сусветнай рэвалюцыі, а таксама разрыў адносін з Англіяй былі ўспрыняты ў СССР як пачатак падрыхтоўкі да адкрытай агрэсіі з боку заходніх дзяржаў.

У гэты ж час адбываецца выкрышталізацыя савецкага разумення ідэі беларускай дзяржаўнасці. Этапным у гэтым сэнсе з’яўляецца 1927 г. У гэты год адбыўся VIII Усебеларускі з’езд Саветаў і прыняцце ім жа другой Канстытуцыі БССР.

Фактычна распрацоўка новай канстытуцыі пачалася яшчэ ў 1924 г. пасля прыняцця Канстытуцыі СССР, што патрабавала адпаведных змен у канстытуцыях увайшоўшых у яго склад рэспублік. Але паколькі першы варыянт, распрацаваны ў 1924-1925 гг., быў адхілены з прычыны занадта шырокіх паўнамоцтваў вышэйшых органаў рэспублікі [1], то працэс прыняцця канстытуцыі зацягнуўся ажно да 1927 г. Гэтая канстытуцыя мела на мэце не толькі ўнармаваць дзейнасць усіх дзяржаўных органаў, але і вызначыць кампетэнцыю дзяржаўных органаў БССР у складзе СССР.

Але і ў гэты час назіраюцца пэўныя супярэчнасці ў разуменні беларускай дзяржаўнасці ў кіруючых колах БССР. Так, у прамове старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякова на 4 сесіі ЦВК БССР сёмага склікання аб міжнародным становішчы ад 18 студзеня 1927 г. гаварылася: «Савецкая Беларусь ёсць частка Савецкага Саюза, які з’яўляецца адзінай дзяржавай, дзяржавай добраахвотнай сувязі паміж савецкімі рэспублікамі»[2].

Але, ў Канстытуцыі БССР, якая была зацверджана 11 красавіка 1927 г., ідэя беларускай дзяржаўнасці была замацавана ў некалькі іншым выглядзе. Спынімся больш падрабязна на аналізе гэтага дакумента.

Так, у артыкуле 1 гаворыцца: « Гэтая Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі (БССР) грунтуецца на асноўных палажэннях дэкларацыі праў працоўнага і эксплёатуемага народу, прынятае III Ўсерасійскім Зьездам Саветаў, на маніфэсце Часовага Рабоча-Сялянскага Савецкага Ўраду Беларусі за 1 студзеня 1919 году, на асновах Канстытуцыі Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі, прынятай 1-м Усебеларускім Зьездам Саветаў, і на дэкляраціі аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі Беларусі за 1 жніўня 1920 году і мае сваёю задачаю забясьпечыць дыктатуру пралетарыяту для прыдушэння буржуазіі, зьнішчэньня эксплёатацыі чалавека чалавекам і ажыцьцяўленьня камунізму, пры якім ня будзе ні падзелу на клясы, ні дзяржаўнае ўлады» [3].

З вышэй выкладзенага можна зрабіць наступныя вывады. Па-першае, адзіным грунтам дзяржаўнасці вызначаюцца пастановы савецкай улады, але толькі тыя з іх, якія непасрэдна тычацца Беларусі. Так, напрыклад, няма ўспаміну пра Літбел, які быццам бы выпадае з гісторыі беларускай дзяржаўнасці, і ў нейкім сэнсе стваральнікі канстытуцыі мелі ў гэтым рацыю. Па-другое, разуменне дзяржаўнасці знаходзіцца цалкам у рэчышчы марксісцкай інтэрпрэтацыі. У той час як прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку былі схільныя разглядаць дзяржаву менавіта як інструмент для вырашэння нацыянальна-культурнага пытання, фактычна адмаўляючы класавую структуру беларускай нацыі. Але поўнасцю абмінуць нацыянальнае пытанне было немагчыма, што знайшло адлюстраванне ў артыкулах 20, 21 і 22, дзе зазначаецца раўнапраўе ўсіх пражываючых на тэрыторыі БССР нацый, права на свабоднае карыстанне роднай мовай, а мовай, пераважнай для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі арганізацыямі, выбіраецца беларуская мова. Паняцце дзяржаўнай мовы адсутнічае, а ў артыкуле 23 проста зазначаецца: «Важнейшыя заканадаўчыя акты публікуюцца на беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай мовах»[4].

Звернемся да іншых праграмных палажэнняў, зафіксаваных у Канстытуцыі. У артыкуле 2 зазначаецца: «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка ёсць сацыялістычная дзяржава дыктатуры пралетарыяту, якая ажыццяўляе свае задачы на грунце саюзу рабочых і сялян.

Уся ўлада ў межах Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі належыць саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскім дэпутатаў»[5].

Як бачна, і ў дадзенай Канстытуцыі, зноў перамог, хутчэй не без ціску цэнтральнага кіраўніцтва РКП(б), дагматычны марксісцкі падыход, хаця прадстаўнікамі розных беларускіх

колаў уздымалася пытанне аб замене лозунгу «дыктатуры пралетарыяту» на лозунг «дыктатуры працоўнага народа,» паколькі пралетарыят у Беларусі быў нешматлікі. Але кіраўніцтва БССР засталося непахісным ў гэтым пытанні.

Можна выказаць меркаванне, што гэтая норма была ўведзена пад ціскам цэнтральнага кіраўніцтва СССР, бо незразумела, чаму дадзенае палажэнне адсутнічае ў канстытуцыі РСФСР 1925 г. і есць у Канстытуцыі БССР 1927 г.

Параўнанне гэтых дзвюх Канстытуцый дае даволі цікавы матэрыял для даследчыка, тым больш, што гэтай праблемай пакуль ніхто не займаўся. Таму спачатку хацелася б зрабіць некалькі папярэдніх заўваг.

Па-першае, як вядома, утварэнне СССР і прынящце яго Канстытуцыі патрабавала ўнясення адпаведных змен у канстытуцыі саюзных рэспублік. Так, новая канстытуцыя РСФСР была прынятая ўжо ў 1925 г., а новая беларуская – толькі ў 1927 г. Даследчыкі гісторыі і права Беларусі В.А.Круталевіч і І. А. Юхо тлумачаць гэта тым, што распрацоўка новай канстытуцыі пачалася яшчэ ў сакавіку 1924 г. на VI Усебеларускім Надзвычайным з'ездзе Саветаў, «але праект Канстытуцыі БССР, падрыхтаваны ў 1924 – 1925 гг., што замацоўваў шырокія паўнамоцтвы вышэйшых органаў рэспублікі, быў адхілены. На пачатку 1927 г. па рашэнню Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі была ўтворана канстытуцыйная камісія, якая і падрыхтавала патрэбны праект Канстытуцыі, што быў адобраны Бюро ЦК КП(б)Б.»[6]

Пэўна, з 1925 па 1927 гг. ішло ўпартае змаганне, каб замацаваць за рэспубліканскай уладай шырокія паўнамоцтвы, якое, скончылася перамогай цэнтральнай улады СССР.

Па-другое, паколькі Канстытуцыя БССР 1927 г. ў значнай ступені дубліруе Канстытуцыю РСФСР 1925 г., найбольшую цікавасць уяўляюць тыя разыходжанні, якія выяўляюцца ў тэкстах. Яны цікавыя нам з двух бакоў – як сведчанне эвалюцыі поглядаў на асновы дзяржаўнага ладу ў перыяд 1925-1927 гг. і як адлюстраванне пэўных адрозненняў у статусе РСФСР і БССР у рамках СССР. Звернемся да больш значных з іх.

Першае, зменены парадак артыкулаў (так, напрыклад, у канстытуцыі РСФСР 1925 г. у 4 артыкуле ідзе гаворка аб свабодзе сумлення[7], у той час, як у канстытуцыі БССР гэтаму прысвечаны 12 артыкул, а ў чацьвёртым ідзе гаворка аб узаемаадносінах і месцы БССР у складзе СССР[8]). Гэта надае Канстытуцыі БССР іншую, больш вытрыманую ідэалагічную афарбоўку ва ўмовах згортвання НЭП.

Другое, узмоцнены пэўныя ідэалагічныя моманты ў бок дагматычнага разумення марксізму. Напрыклад, у артыкуле 2 Канстытуцыі РСФСР гаворыцца: «Расійская Рэспубліка ёсць сацыялістычная дзяржава рабочых і сялян, якая будуецца на грунце федэрацыі нацыянальных савецкіх рэспублік.»[9] Адпаведны артыкул у Канстытуцыі БССР гучыць у наступнай рэдакцыі: «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка ёсць сацыялістычная дзяржава дыктатуры пралетарыяту, якая ажыцьцяўляе свае задачы на грунце саюзу рабочых і сялян.»[10] Як ужо казалася раней, узгадаванне аб дыктатуры пралетарыяту азначала паварот ва ўнутранай палітыцы савецкага кіраўніцтва.

Трэцяе, разыходжанні ў тэкстах, наяўнасць ці адсутнасць пэўных частак. У межах дадзенай працы немагчыма прааналізаваць іх усе, таму засяродзімся на галоўных з іх. На нашу думку, найбольш значнымі з'яўляюцца наступныя – адсутнасць у Канстытуцыі БССР палажэння аб фарміраванні і кантролю за бюджэтам рэспублікі і наяўнасць палажэнняў аб мове і тэрыторыі.

Што тычыцца бюджэтнага пытання, то вярхоўны кантроль за дзяржаўнымі даходамі і расходамі РСФСР, згодна артыкулу 16 Канстытуцыі РСФСР, аднесены да выключнага ведама Ўсерасійскага З'езда Саветаў і Усерасійскага ЦВК.[11] Больш таго, у Канстытуцыі РСФСР маецца раздзел 5 «Аб бюджэтным праве», у той час, як дадзены раздзел не толькі цалкам адсутнічае ў Канстытуцыі БССР, але нават права кантролю за бюджэтам наогул не ўзгадваецца ў раздзеле «Аб кампэтэнцыі Ўсебеларускага Зьезду Саветаў і Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі». На нашу думку, гэта сведчыць аб росце цэнтралізатарскіх тэндэнцый і наступовай страце рэшткаў дзяржаўнага суверэнітэту, якія назіраліся ў пачатку 20-х гадоў.

Але, калі разглядаць працэсы, што праходзілі ў той час на Беларусі як комплекс дзяржаўна-нацыянальнай творчасці, то нягледзячы на пройгрыш на дзяржаўным накірунку, на нацыянальна-культурным змаганне яшчэ працягвалася, што знайшло адлюстраванне і ў Канстытуцыі БССР 1927 г. Так, у ёй змешчаны артыкулы 22 і 24 частка «б», якія не толькі не маюць аналагаў у Канстытуцыі РСФСР, але па свайму духу адпавядаюць папярэдняму працэсу нацыянальнага адраджэння.

Артыкул 22 фактычна замацоўвае вядучую ролю за беларускай мовай, што дае падставы лічыць, што ў 1927 годзе ў кіраўніцтва БССР, нягледзячы на барацьбу з «беларускім шавінізмам», не назіралася імкненняў да згортвання палітыкі беларусізацыі, бо інакш не мела сэнсу спецыяльна замацоўваць за беларускай мовай статус мовы, пераважнай для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі [12].

Магчыма яшчэ большую цікавасць мае частка «б» артыкула 24, у якой гаворыцца, што: « Да выключнае кампэтэнцыі Ўсебеларускага Зьезду Саветаў належыць: ...б) вырашэньне, у адпаведнасьці з Канстытуцыяю Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, пытаньняў аб зьмене граніц Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі.»[13]

На нашу думку, гэта сведчыць, што тэрытарыяльнае пытанне ў гэты час таксама лічылася канчаткова нявырашаным. І хаця, як паказаў час, пытанне аб усходніх межах болей не ўздымалася, можна меркаваць, што менавіта гэты накірунак меўся на ўвазе. Таму ёсць пэўныя пацвярджэнні. Па-першае, у разглядаемы час ВКП(б) ужо адмовілася ад ідэі перманентнай рэвалюцыі. Была таксама згорнутая падрыхтоўка паўстання ў Заходняй Беларусі. І першае, і другое добра было вядома кіраўніцтву БССР, а разлічваць неяк інакш змяніць заходнюю мяжу ў той час не ўяўлялася магчымым. Па-другое, у артыкуле ідзе гаворка аб Канстытуцыі СССР і, пэўна, маецца на ўвазе змена граніц менавіта ў дадзенай дзяржаве. Па-трэцяе, як вядома, не ўсе тыя землі, на якія прэтэндавала БССР, былі ўключаны ў яе склад падчас узбуйненняў 1924 і 1926 гг. Як сведчаць архіўныя дакументы, кіраўніцтва БССР не лічыла працэс фарміравання тэрыторыі завершаным [14].

У плоскасці развіцця ідэі беларускай дзяржаўнасці вышэй сказанае азначае, што вымушанае пасутпіцца дзяржаўным суверэнітэтам кіраўніцтва БССР сканцэнтравала сваю ўвагу на тых накірунках, дзе нацыянальна-дзяржаўная творчасць была яшчэ магчыма. Гэта культурнае адраджэнне і збіранне беларускіх этнаграфічных зямель. У 1927 г. Не лічылася неабходным згортваць гэтыя працэсы.

Абагульняючы, можна зазначыць наступнае. У гэты перыяд фактычна ліквідуюцца колькі-небудзь значныя цэнтры небальшавіцкага накірунку ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве Беларусі, і дзеячы савецкай арыентацыі пачынаюць прэтэндаваць на ролю манапалістаў у дадзенай сферы. Гэтыя прэтэнзіі падмацоўваліся тым, што беларуская дзяржаўнасць не ў выглядзе ідэі, а ў рэальным увасабленні існавала толькі ў форме БССР.

З другога ж боку, абмежаванасць суверэнітэту БССР была відавочна для яе апанентаў. Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку неаднаразова звярталі ўвагу на сялянскі характар беларускай нацыі і былі схільныя да эсэраўскага лозунгу «дыктатуры працоўнага народа».

Такім чынам, можна зазначыць, што ў перыяд 1922 – 1927 г.г. у беларускім нацыянальным руху ўсталяваліся два погляды на праблему рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Першы ўспрымаў БССР як практычнае ўвасабленне барацьбы беларускага народа за сваю дзяржаўнасць, а асаблівасці яе становішча адносіў да спецыфікі існавання сацыялістычнай краіны ў працэсе станаўлення яе дзяржаўнасці. Другі разглядаў БССР як квазі-рэспубліку, сказіўшую першапачатковы ідэал, і адкладваў вырашэнне беларускага пытання на аддаленую перспектыву.

**Літаратура**


1. Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – С.158.
2. Звязда. – 1927. – 20 студзеня.
3. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. – Менск, 1927. – С. 3.
4. Там жа. – С. 6.
5. Там жа. – С. 3.
6. Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – С.158–159.
7. Конституционное право России. Основные законы, конституции и документы XVIII–XX веков: хрестоматия. – Новосибирск: ООО «Издательство ЮКЭА», 2000. – С.523.
8. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. Менск, 1927. – С. 3–4.
9. Конституционное право России. С. 523.
10. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. – Менск, 1927. – С. 3.
11. Конституционное право России. Основные законы, конституции и документы XVIII–XX веков: хрестоматия. – Новосибирск: ООО «Издательство ЮКЭА», 2000. – С.523.
12. Там жа. – С. 6.
13. Там жа.
14. Хоміч, С. Асноўныя этапы фарміравання тэрыторыі БССР (1918–1926) / С. Хоміч // Бел. гістар. агляд. – 2000. – Т. 7, сш. 2. – С. 363.